СПАДЧЫНА

# Мова маёй зямлі

**Багаты наш самабытны палескі край шчырымі і таленавітымі людзьмі. Імя Галіны Іосіфаўны Лазіцкай вядома чытачам «Палескай праўды», асабліва прыхільнікам паэтычнай творчасці, бо яе вершы не раз друкаваліся на старонках выдання. Зараз жа прапануем вашай увазе эсэ аўтара «Мова маёй зямлі». Гэты выдатны твор адзначаны дыпломам першай ступені конкурса творчых работ, прысвечанага Году народнага адзінства, арганізатарам якога выступіў Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Віншуем Галіну Іосіфаўну з перамогай, а чытачам жадаем атрымаць асалоду ад знаёмства с гэтым цудоўным творам.**

*Край Палессем родны наш завецца,*
*Дзе размовы каларытны смак.*

Прыщемкі не толькі мякка агортвалі наваколле, напамінаючы прыбліжэнне яшчэ адной летняй ночы, але абяцалі ціш і спакой для адпачынку, каб на змену мінуламу дню прыйшла новая ранішняя вясковая ўвішнасць. І здавалася, галовы стомленых сінінцаў-палешукоў толькі дакрануліся да падушак, як пеўні з падворка ў падворак гучным «кукарэку» абвяшчалі нараджэнне новага дня. Паціху віднела, і то там, то сям чуліся птушыныя пераклічкі, што напаўнялі спевам дрымотную раніцу.

Мая родная вёсачка Сінін, *поділяна на Тэе сэло і Гэтэ Стругэю, якая зарэ ўгнана ў прокопану канаву,* прачыналася.

*Застукалы дзвэры, заскрыпілы колодязы, рэхом одзываўса пэрэстук молоткуў, якымы хозяіны клэпалы косы, – почыналаса косовыца. А іті косарам трэбуло на болото, дэ былы дзялкы, за рэку: кому на Сынынскэ Дубныцкэ, кому на Хвоцныцкэ, чы на пэрэволоку. Хозяйкы з дойныцамы ў руках спэшылы ў хлэвы доіты коровы, подояну выгонялы на сэло, далій управлялы остатне хозяйство, збыралы торбу косарам, бо нэ поесы коўбасы – нэ потянэш і косы. Коровы паслы на ранцы, а пастух, чыя була колейка, збыраў по сэлі статок, гнаў іх на выгон до Стругы, позній, як пудымалосо сонцэ, пэрэгоняў у болото до купычы на Мінічову сэлыбу альбо на Костюкуўе.*

І дзень быў, як год, і год быў, як дзень.

Безупынны сялянскі клопат пра хлеб надзённы. Гаспадарка, дзеці, агароды, соткі, дзялкі, ферма, поле – як замкнутае кола. Прыстасаваныя да гэтых умоў, цяглыя, памяркоўныя палешукі прамаўлялі: *трэба жыть, як набэжыть, бо ж яка дасца долечка од ранку, така будэ й до останку.*

І жылі са сваімі бедамі, клопатамі, радасцямі, гулялі вяселлі, нараджалі дзяцей, дапамагалі адзін аднаму. Не маючы доўгі час тэлевізараў, самі былі носьбітамі нацыянальнай культуры: спявалі, танцавалі і забаўляліся талакой. Культуры адпачынку надавалася патрабавальнасць:

*«Вучыса, доньку, таньчыть, а робыты бэда навучыть».*

**(Працяг будзе)**

**Галіна ЛАЗІЦКАЯ**